DOI 10.33294/2523-4234-2019-29-1-186-201

**Сяргей Аношка**

# Каталіцкі касцёл перад аблiччам сучасных маральных выклікаў

У тэксце ўзнімаецца адна з ключавых на сённяшні дзень маральна-этычных праблем, з якою сутыкаецца Каталіцкі касцёл – педафілія ў шэрагах святароў. Выходзячы з кароткага аналізу з’явы педафіліі, пададзеныя канкрэтныя прыклады фактаў. У асобных параграфах артыкула, прысвечаных гадам пантыфікату Бэнэдыкта XVI і Францішка, звяртаецца асаблівая ўвага на зарадчыя сродкі і методыку барацьбы з педафіліяй у Касцёле. Не абыходзячы істотных і вострых момантаў, аўтарам узнімаецца спроба адказаць на пытанне, у чым хаваюцца карэнні апісаных маральных і крымінальных сексуальных злачынстваў. Чацвёрты параграф з’яўляецца своеасабліваю рэфлексіяй на тэму магчымых сувязяў і паралеляў між педафіліяй і гомасексуалізмам у Касцёле.

*Ключавыя словы*: гомасексуалізм, кананічнае права, Каталіцкі касцёл, пантыфікат, педафілія, сексуальныя злачынствы, эфебафілія

**Сергій Аношко**

**Католицька церква перед лицем сучасних моральних викликів**

Розглянено одну з найгостріших і ключових проблем, з якими стикається сьогодні Католицька церква, – педофілію серед священиків. Здійснено аналіз феномена педофілії та обґрунтовано необхідність відрізняти її від ефебофілії. Наведено приклади виявлених, вивчених і підтверджених фактів сексуального насильства над неповнолітніми, а також дії, до яких вони допровадили на морально-етичному рівні.

Особливу увагу приділено превентивним заходам та методам боротьби з педофілією в Католицькій церкві. Висвітлено різні позиції пап римських щодо цієї проблеми. Також увагу приділено рокам понтифікату папи Бенедикта XVI та папи Франциска. З метою висвітлення проблеми злочинів сексуального характеру в католицизмі подано коротку історичну розповідь про зміни у сфері етики та сексуальності, що було викликано поширенням та пропагандою так званих ідей сексуальної революції 1968 р. Запропоновано роздуми над потенційними джерелами ідеологічних загроз.

Не ігноруючи значних і важливих моментів, автор також намагається відповісти на питання про коріння морального насильства і злочинності. Четверта частина статті є своєрідними роздумами щодо можливих зв’язків між гомосексуалізмом і педофілією в Католицькій церкві.

Зроблено спробу відповісти на питання про глибину сучасної моральної кризи. Сформульовано тезу про відсутність доброї волі в деяких середовищах, зокрема й у Церкві, серйозно займатися проблемою педофілії, адже тоді було б необхідно критикувати ідеологію толерантності, що домінує в західних країнах, і прийняття не-гетеросексуальної орієнтації, а це вже призведе до реальної ідеологічної кризи.

*Ключові слова:* гомосексуалізм, канонічне право, Католицька церква, папство, педофілія, сексуальні злочини, ефебофілія

У апошнія гады сродкі масавай інфармацыі па ўсім свеце нястомна апавяшчаюць грамадскую думку пра маральна-этычныя праблемы, якія датычаць жыцця духоўных Каталіцкага касцёла. У імгненне вока шырока папулярнымі

сталі разнастайныя анкеты і сацыяльныя апытанні большае ці меншае навуковае вартасці пад назвамі кшталту “Самыя значныя праблемы Касцёла”. Паводле вынікаў тых жа апытанняў – часцяком такія рэчы адбываюцца таксама й у традыцыйных каталіцкіх краінах, як Польшча, – вынікае, што першыя тры месцы ў дадзеным рэйтынгу займаюць педафілія, гомасексуалізм і мяшанне Касцёла да палітыкі [1]. І, калі апошні момант ускосна таксама датычыць спраў маральных, у дадзеным артыкуле будзе звернута ўвага на першыя дзве праблемы: педафілію і гомасексуалізм.

Цягам апошніх некалькіх гадоў педафільскія скандалы духоўных сутрасаюць грамадскасцю ў шматлікіх краінах на свеце. Хаця першыя аскарджванні з’явіліся яшчэ ў 50-ыя гг. мінулага стагоддзя, сексуальныя дамаганні каталіцкіх святароў сталі адною з істотных тэм і маральным выклікам менавіта апошніх дэкадаў XX–XXI стагоддзяў, з якімі сёння сутыкаецца Касцёл. Інтэрнэт і лічбавыя СМІ спрычыніліся да таго, што дадзены выклік не ведае межаў: ані дзяржаўных, ані культурных, ані нават цывілізацыйных [2, s. 58]. У верасні 2015 г. на фестывалі кіно ў Венецыі адбылася прэм’ера мастацкай стужкі рэжысёра Тома Мак-Карці пад назваю “Spotlight” (з 25 лютага 2016 г. пад назваю “У центрі уваги” фільм можна было ўбачыць ува Украіне). Гэта драматычная гісторыя, заснаваная на рэальных падзеях, якая апавядае пра журналісцкае расследаванне, што вялося супрацоўнікамі амерыканскай газеты “The Boston Globe” адносна святароў-педафілаў бостанскай Каталіцкай царквы. Фільм атрымаў шэраг узнагародаў, у тым ліку знакамітую прэмію “Oscar” Амерыканскай Акадэміі кінематаграфічных мастацтваў і навук [3, p. 66].

Праблема, якой быў прысвечаны ўзгаданы вышэй фільм, стала вельмі актуальнаю, на педафілію зноў скіраваліся позіркі не толькі публіцыстаў, але й уладаў самога Касцёла (хаця на дадзеную тэматыку багата пішуць, але не ўсе пазіцыі заслугоўваюць на ўвагу. Тым не меней, варта ўзгадаць, што за апошнюю дэкаду з’явіліся й змястоўныя тэматычныя працы на розных мовах [4; 5; 6]). Дадзены маральны выклік стаў вельмі істотны, але не толькі па прычыне цяжару дадзеных злачынстваў, але таксама й таму, што нам вельмі часта паказваецца толькі адзін бок дадзенае праблемы, зусім адсоўваючы ў цень тое, пра што казаць не вельмі выгадна прыхільнікам ідэалогіі постмадэрнізму ды ўсялякіх модных лібертынскіх поглядаў. Справа ў тым, што пытанне педафіліі неад’емна і непарыўна, як сведчаць дадзеныя, звязана з праблемаю гомасексуалізма, бо хлопцы-падлеткі становяцца ахвярамі такіх злачынцаў часцей, чым дзяўчаты. Але ж сённяшні свет жыве зусім іншымі маральнымі катэгорыямі, калі адменная сексуальная арыентацыя становіцца не толькі чымсьці звычайным, але нават модным ці пажаданым у пэўных колах грамадства. Таму галоўны ўдар наносіцца на наступства, а не на крыніцу праблемы.

Дзеля таго, каб спрабаваць звярнуць сваю ўвагу на складанасць дадзенае праблематыкі і высветліць паходжанне маральных злачынстваў, у дадзеным

тэксце будзе ўзнята спроба аналізавання магчымых крыніцаў педафіліі ў Касцёле разам з насвятленнем тых момантаў, пра якія пэўныя СМІ не жадаюць казаць. Такую сітуацыю можна вытлумачыць тым, што філасофія постмадэрнізма хаця й не выступае супраць канкрэтных сістэмаў этыкі і маральнасці, тым не меней імкнецца зліквідаваць агульную этыку ўвогуле [7, s. 25].

1. Скандал і зло педафіліі

У 2015 г. папа Францішак звярнуўся да ўсіх католікаў на свеце з просьбаю арганізацыі Дня малітвы і пакуты ў інтэнцыі ахвяр сексуальных злачынстваў. Такія мерапрыемствы адбыліся між іншым у Аўстраліі, Паўднёва-Афрыканскае Рэспубліцы, Францыі, Швейцарыі, а ў 2017 г. пакутныя набажэнствы прайшлі ў Ірландыі, дзе па прычыне цяжкіх амаральных злачынстваў Каталіцкі касцёл цягам апошіх гадоў знаходзіцца ў глыбокім крызісе; першыя рапарты адносна злоўжываннях былі апублікаваныя там яшчэ ў 2009 г. [8, p. 165]. Варта адзначыць, што барацьба з педафіліяй у Касцёле актыўна пачалася за часоў пантыфікату папы Бэнэдыкта XVI, а сёння ягоную нялёгкую місію спрабуе працягваць ягоны пераемнік, папа Францішак.

На вялікі жаль, сёння педафілія стала сапраўдным злом, якое пашыраецца на свеце, і датычыць, каб было зразумела, не толькі духоўных, але разнастайных сацыяльных груп. Чым жа ёсць педафілія? Паводле класічнай дэфініцыі, педафілія (ад грэч. παιδός і φιλία) – гэта адзін з відаў парафіліі, пад якою разумеюцца сексуальныя кантакты дарослых з дзецьмі [9, с. 459]. Педафілія можа прымаць характар гетэрасексуальны, гомасексуальны альбо бісексуальны. Калі мы чуем у СМІ гэтае слова, хутчэй за ўсё яно ўжываецца аўтарамі матэрыялаў у шырокім сэнсе, аднак на патрэбы навуковай рэфлексіі варта ўсё-такі зрабіць пэўнае ўдакладненне. А менавіта, педафіліяй варта называць толькі і выключна чыны сексуальнага характара ў дачыненні дзяцей, якія не асягнулі ўзросту палавога саспявання, то бок да 12 гадоў; чыны адносна асобаў ва ўзросце 12–18/19 гадоў называюцца эфебафіліяй[1] (часам тая мяжа бярэцца ад 14–15 гадоў) [10, p. 28–29].

13 сакавіка 2010 г. у італьянскім дзённіку “Avvenire” з’явіўся артыкул, прысвечаны тэматыцы педафіліі. З тэксту вынікала, што цягам апошняй дэкады тачыліся больш 3000 судовых працэсаў супраць духоўных Касцёла: каля 60 % выпадкаў былі ахарактарызаваныя як гомасексуальная эфебафілія, 30 % – гетэрасексуальныя чыны, і ўрэшце 10 % – акты педафіліі з дзецьмі, што не асягнулі ўзросту полавага саспявання [11, p. 23]. Гэтыя дадзеныя, а таксама шэраг іншых грунтоўных публікацый даюць Касцёлу, як не дзіўна, вялікую карысць, бо падыходзяць да з’явы гвалту супраць дзяцей не з пункту гледжання таннай журналісцкай сенсацыі, але толькі спрабуюць паказаць істоту справы, звяртаючы ўвагу

[1] Некаторыя псіхолагі вылучаюць яшчэ адну асобную катэгорыю – інфантафілію ці непіяфілію, – калі аб’ектам зацікаўленасці з боку дарослае асобы становіцца немаўля альбо дзіцяці да 5 гадоў.

на праблемы маральнага, выхаваўчага альбо сацыяльнага плана. Такі падыход дазваляе ўбачыць праблему больш глабальна, калі педафілія ды эфебафілія лічуцца ўжо не толькі формаю гвалту супраць дзяцей у канкрэтным асяроддзі (напрыклад, у сям'і ці ў выхаваўчай пляцоўцы), але прыбіраюць зусім іншае вымярэнне, калі дзеці ледзь не прамыслова бываюць выкарыстаныя ўжо ў сусветным маштабе (між іншым, варта тут узгадаць пра так званы дзіцячы сексуальны турызм у краінах Паўднёва-Усходняй Азіі і Лацінскай Амерыкі) [12, р. 445–447].

Нягледзячы на сур'ёзнасць справы ўсё часцей чуваць галасы крытыкі адносна ініцыятывы Дня малітвы, прапанаванай Францішкам. Здавалася б, чаму так шляхетная ініцыятыва сустракаецца з супрацівам, ды яшчэ і ўнутры Касцёла? Тлумачыцца гэта, перадусім, бракам у СМІ аб'ектыўнасці насвятлення праблематыкі педафіліі: у публічнай дамене амаль цалкам замацаваўся вобраз каталіцкага ксяндза-педафіла, хаця неяк не чуваць крытыкі і самакрытыкі з боку асяроддзя палітыкаў, настаўнікаў, бізнесменаў ці саміх жа журналістаў. І хаця такую паставу таксама можна зразумець, не варта забывацца на тое, што сітуацыя з педафіліяй стала адным з маральных выклікаў Касцёла яшчэ ў 80-ыя гг. XX стагоддзя, калі гэтая драма пачала разыходзіцца ў ЗША, а потым з'явілася таксама і ў Еўропе.

Якія ж асноўныя прычыны гэтага злачынства, якое ўварвалася ў нашыя шэрагі? Бадай, для некага будзе нечаканым і нават дзіўным, калі на першым месцы будзе ўзгадана так званая сексуальная рэвалюцыя 1968 г., што прынесла багата замяшання ў галовах не толькі вернікаў. Адзін з вядомых ідэолагаў узгаданага руху, сацыёлаг і філосаф-неамарксіст, прадстаўнік франкфурцкай школы Герберт Маркузэ (1898–1979), абвяшчаў ідэю сексуальнага вызвалення чалавека. Кніжкі аўтарства Г. Маркузэ былі не толькі чытаныя заходнімі студэнтамі ў 60–70-ых гг., але думкі, якія там утрымліваліся, былі рэалізаваныя моладдзю на практыцы [13, р. 199]. Погляды рэвалюцыянераў 1968 г. паступова пранікалі й у каталіцкія колы, становячыся чымсьці ў кшталце траянскага каня.

Першаю спробаю дакладна паглядзець на праблему зрабіў Каталіцкі касцёл ЗША, дзе ў 2004 г. быў апублікаваны “John Jay Report”. Вынікі працы следчых камісій, што складаліся з пракурораў, юрыстаў, псіхолагаў і паліцыі, выявілі, што каля 81 % злачынстваў на сексуальнай глебе ў ЗША за перыяд 1950–2002 гг. адносна непаўнагадовых з боку духоўных мелі характар стасункаў гомасексуальных, а большасць ахвяр (каля 78 %) былі ўжо пасля ўзросту полавага саспявання [14, р. 325]. Каталіцкі касцёл выплаціў тады ахвярам больш $ 4 млрд, што прывяло да банкроцтва 13 дыяцэзій (архідыяцэзія Бостан вымушана была тады закрыць траціну ад усіх сваіх парафій і нават выставіць на продаж палац арцыбіскупа, каб магчы выплаціць адшкадаванні ахвярам).

Калі ж паглядзець на абсалютныя лічбы ў ЗША, дык на 10 тыс. абвінавачваных у сексуальным гвалце супраць дзяцей прыпадала толькі тры асобы каталіцкіх святароў, то-бок 0,03 % усіх выкрытых чынаў сексуальнага гвалту супраць

непаўнагадовых [15, s. 46]. У 2010 г. тая ж інстытуцыя паўтарыла даследванні на падставе новых матэрыялаў, сягаючы перыяду 1950–2012 гг. Новы рапарт паказаў, што ахвярамі 16 тыс. педафілаў-святароў сталі 6 тыс. непаўнагадовых [16, s. 304]. Менавіта такія дакладныя сухія звесткі дазваляюць нам больш аб’ектыўна і непрадузята паглядзець на адну з самых балючых ранаў сучаснага Касцёла.

Іншым цікавым прыкладам, на які варта звярнуць увагу, з’яўляецца сітуацыя ў Аўстраліі, дзе ў 2013 г. была створаная Каралеўская камісія, што мае сачыць за злачынствамі адносна дзяцей не толькі ў каталіцкіх пляцоўках, але таксама весці маніторынг школ, спартовых клубаў, медычных пляцовак ці розных таварыстваў. На жаль, першыя вынікі працы Камісіі (снежань 2017 г.) паказваюць, што сітуацыя з гвалтам супраць дзяцей сярод каталіцкіх духоўных мае горшыя вынікі, чым у ЗША: каля 7 % ад агульнай лічбы духоўных Аўстраліі. На ўстановы, звязаныя з Царквою, прыпадае большасць выпадкаў сексуальнага выкарыстання непаўнагадовых: 68 % датычыла каталіцкіх інстытуцый, 12,3 % – англіканскіх[2] [17, p. 52].

Драма сексуальнага выкарыстання дзяцей каталіцкімі святарамі прывяла ў шэрагу краін да сур’ёзнага крызісу Каталіцкага касцёла. Асноўнымі вынікамі гэтых амаральных чынаў сталі негатыўны вобраз духоўных у грамадскай сферы, вялічэзнае зніжэнне колькасці святарскіх і манаскіх пакліканняў, маргіналізацыя свецкіх католікаў у грамадскім жыцці (часта іх абвінавачваюць у наўмысным укрыванні фактаў злачынстваў), крызіс верагоднасці Касцёла ў якасці аднаго з асноўных сацыяльных інстытутаў, абмежаванне фінансавае падтрымкі і датацый каталіцкіх установаў і праектаў, у тым ліку дабрачынных ініцыятыў, звязаных з Каталіцкім касцёлам. Варта таксама памятаць пра тое, што будучы “запэцканым” у так істотных справах, Каталіцкі касцёл па сутнасці сам адабраў сабе права выказваўца па шэрагу маральна-этычных пытанняў і праблемаў сучаснага грамадства, што пакрысе вядзе да паступовай элімінацыі прысутнасці хрысціянскага голаса не толькі ў СМІ, але таксама і ў свядомасці людзей.

2. Педафілія ў Касцёле за перыяд пантыфікату Бэнэдыкта XVI

Пачатак скандалаў, звязаных з педафіліяй у Каталіцкім касцёле, супаў з канцом пантыфікату Яна Паўла II, таму ягоны пераемнік Бэнэдыкт XVI меў сур’ёзна займацца тымі справамі. Для новага пантыфіка тыя рэчы цяжка было назваць чымсьці новым, бо яшчэ ў сваю бытнасць прэфектам Кангрэгацыі Веравучэння кардынал Ёзэф Ратцынгер меў дачыненне са справамі педафіліі духоўных, рапарты пра якія надыходзілі да ягонай дыкастэрыі. Злачынствы ў Ірландыі і ЗША сталі прычынаю з’яўлення афіцыйнага дакумента “De delictis gravioribus”, падпісанага кард. Ратцынгерам і абп. Бертонэ [18, p. 232].

[2] У 2016 г. была скліканая спецыяльная камісія Англіканскай царквы, якая займаецца фактамі сексуальнага выкарыстання непаўнагадовых. Першыя ацэнкі матэрыялаў працы камісіі сведчаць, што маштаб педафіліі сярод англіканаў будзе значна большы, чым сярод духоўных каталіцкіх.

Ліст датычыў не толькі сексуальных злачынстваў, але й увогуле цяжкіх выпадкаў зламання касцёльнае дысцыпліны. Між іншым у лісце вылічаліся кары, якія могуць напаткаць тых святароў, што здзейснілі самыя цяжкія злачынствы: суспенса – забарона ўсіх ці пэўных дзеянняў, звязаных з удзяленнем сакрамэнтаў, забарона публічнай цэлебрацыі Святой імшы, забарона спавядаць, выдаленне злачынцы з духоўнага стану. Акрамя таго, усе надзвычайныя сітуацыі атрымалі статус "secretum pontificum" – папскай таямніцы [19, s. 28].

У 2004 г. па гучным скандале ў аўстрыйскай духоўнай семінарыі St. Pölten, дзе былі выкрытыя гомасексуальныя адносіны паміж кіраўніцтвам навучальнай установы і некаторымі клерыкамі, а таксама парнаграфічныя здымкі і фільмы ў семінарыйным камп'ютары, Апостальскі Пасад пастанавіў адразу ж зачыніць семінарыю, але тое не спыніла крызісу – каля 400 тыс. аўстрыйскіх католікаў адыйшло тады ад Касцёла [20, p. 149]. Таму, можа, невыпадкова, яшчэ перад выбраннем на трон ап. Пятра кард. Ратцынгер у часе малітвы Крыжовага Шляху ў рымскім Калізее казаў пра бруды Касцёла і грахі, у якіх жывуць святары, параўноўваючы Касцёл да чоўна, які набірае з усіх бакоў ваду і паступова тоне.

Першым сур'ёзным выклікам для новага пантыфіка стала сітуацыя з 2005 г. у Ірландыі, дзе ад 2000 г. дзейнічала спецыяльная камісія, якая займалася справамі злачынстваў супраць дзяцей на сексуальнай глебе. У 2005 г. вынікі першага рапарту былі шакуючымі: ад 1940 г. у Ірландыі былі выяўлены 102 святары-педафіла, ахвярамі якіх сталі амаль 400 дзяцей [16, s. 305]. Чарговыя рапарты былі падрыхтаваныя ў 2009 і 2011 гг., вынікі якіх былі яшчэ больш страшнымі: лічба ахвяраў псіхічнага, фізічнага і сексуальнага гвалту сягала ўжо 30 тыс.

У 2010 г. папа Бэнэдыкт XVI скіраваў да католікаў Ірландыі адмысловы ліст, звяртаючыся асабліва да ахвяраў гвалту. У тэксце пантыфік не толькі казаў пра адказнасць злачынцаў, але таксама звяртаўся да мясцовых біскупаў, якіх залічыў да злачынцаў з-за іх абыякавасці [21, s. 103]. Праведзеныя праз Irish National Election Study ў 2011 г. апытанні сведчаць, што каля 50 % згубіла давер да інстытуцыянальнага Касцёла, а ў 2012 г. апытанні паказвалі, што каля 65 % ацэньвалі намаганні Ватыкана ў барацьбе з педафіліяй як "марныя" [22, p. 69].

Не могуць не здзіўляць таксама іншыя дадзеныя: у жніўні 2018 г. у Ірландыі пад эгідаю Касцёла адбылася Сусветная сустрэча сем'яў. Месяц раней арцыбіскуп Дубліна Дзіармуід Марцін у адным са сваіх інтэрв'ю заявіў, што на кангрэс таксама запрошаныя "нетрадыцыйныя сем'і", а Касцёл павінен скрэсліць са свайго Катэхізіса палажэнне аб тым, што гомасексуалізм з'яўляецца "аб'ектыўна неўпарадкаваным" [23, s. 78]. Як бачым, крызіс у Касцёле Ірландыі і пустыя духоўныя семінарыі нічаму не навучылі, у тым ліку каталіцкіх (ці яшчэ каталіцкіх?) іерархаў[3]. У выніку педафільскага скандалу былі зачыненыя ўсе каталіц-

[3] У 2015 г. па выніках праведзенага рэферэндуму Ірландыя стала першаю краінаю на свеце, якая ў выніку плебісцыту легалізавала гомасексуальныя шлюбы. У 2018 г. у Ірландыі легалізавалі аборты.

кія духоўныя семінарыі на выспе, а ўлады Ірландыі разарвалі дыпламатычныя адносіны з Апостальскім Пасадам.

Чарговым краем, які быў крануты педафільскімі скандаламі, была айчына пантыфіка – Нямеччына. Сітуацыя ў краю сведчыла пра тое, як глыбока маральныя адступствы падзялілі мясцовы Касцёл. Злачынствы сталі плямаю на аўтарытэце самога папы: толькі менш чвэрці насельніцтва ягонай роднай краіны давярала яму [24, p. 5].

Чарговыя скандалы ў 2010–2011 гг. узрушылі краінамі Бенілюксу. Следства выкрыла, што выпадкі педафіліі ў бельгійскім Касцёле датычылі перыяду 50–60 гг., менавіта тады, калі ідэі рэвалюцыі 1968 г. дасягнулі ў тым ліку касцёльных колаў. Выглядае чымсьці неверагодным, але найбуйнейшы каталіцкі бельгійскі штотыднёвік “Kerk en Leven”, які акрамя таго, што цягам многіх гадоў асвойваў сваіх чытачоў з новым маральным парадыгматам, дык яшчэ і распаўсюджваў брашуры аб новай навуковай вобласці пад назваю “pedophile study”. У брашурах казалася, што бацькі не павінны крытычна ставіцца да сексуальных кантактаў дзяцей з дарослымі, а паніка выкліканая толькі бракам ведаў [25, s. 63]. У 2011 г. упершыню ў еўрапейскай гісторыі некалькі дзясяткаў бельгійскіх ахвяр скіравалі ў суд скаргу супраць не толькі Епіскапата Бельгіі, але нават і Ватыкана.

У 2008 г. новым мітрапалітам Антверпена стаў біскуп Ёхан Бонні, былы рэктар Бельгійскага Калегіуму ў Рыме і прафесар семінарыі Бругэ. Гэты чалавек “праславіўся” тым, што ў 2014 г. фламандскі дзённік “De Morgen” апублікаваў інтэрв’ю з духоўным, дзе ён вельмі актыўна выступаў за легалізацыю так званых гомасексуальных шлюбаў і цэлебрацыю такіх сакрамэнтаў у каталіцкіх храмах. Падобныя погляды падзяляе і кард. Годфрыд Данэлс, былы прымас Бельгіі і арцыбіскуп Бруселя [26, s. 224–225]. Таму не трэба асабліва здзіўляцца, што, калі падобныя погляды абвяшчаюць высокія касцёльныя саноўнікі, да якіх маральных наступстваў тое можа прывесці і, урэшце, прыводзіць.

Пасля выяўлення выкарыстання дзяцей праз біскупа Роджэра Ванелювэ з Бругэ, папа Бэнэдыкт XVI прыняў адстаўку святара, які займаў пасаду ад 1984 г. У пантыфікаце біскупа Рыма і ўсяго Касцёла пачаўся так званы Annus Horribilis, калі біскупы па ўсім свеце пачалі падаваць у адстаўку са сваіх пасадаў альбо па прычыне ўкрывання педафільскіх чынаў сваіх падуладных святароў, альбо таксама з-за абвінавачванняў іх саміх у псіхічным ці фізічным гвалце супраць непаўнагадовых [27, p. 71–72]. Варта падкрэсліць, што за перыяд 2010–2015 гг. сярод ахвяраў, што звярталіся да спецыяльнай міждыяцэзіяльнай камісіі аховы дзяцей і моладзі, 80 % былі мужчынамі, што таксама карэлюе з падобнымі дадзенымі з іншых краін і сведчыць пра дакладна гомасексуальны характар педафіліі тых амаральных актаў. Акрамя таго, 80 % усіх злачынстваў датычыла 70–80 гг. мінулага стагоддзя, калі ідэі сексуальнае рэвалюцыі 1968 г. пранікалі ў тым ліку да свядомасці некаторых каталіцкіх колаў у Касцёле.

Пад уплывам усіх гэтых скандалаў папа Бэнэдыкт XVI у 2010 г. змяніў выдадзены дзевяць гадоў таму дакумент “Delicta Graviora”, паводле каторага быў зменены тэрмін даўнасці для злачынстваў сексуальнага характара з 10 да 20 гадоў (гэты перыяд налічваецца ад моманту, калі ахвяра стала поўнагадоваю). Акрамя таго за такія злачынствы ад гэтага моманту Кангрэгацыя Веравучэння магла караць кардыналаў.

Спецыяльная камісія, якая займалася перыядам 1945–2010 гг., была створаная таксама ў Нідэрландах. У 2011 г. Каталіцкі касцёл у Галандыі стварыў спецыяльны грашовы фундуш, з якога выплочваліся кампенсацыі ахвярам гвалту: ад € 5 тыс. да € 100 тыс. Варта памятаць, што маральны лібертынізм стаў адною з рысаў, з якою сёння Галандыя атаясамліваецца ў Еўропе і свеце, хаця яшчэ напрыканцы 50-гг. XX ст. каля 90 % насельніцтва гэтай краіны былі моцна прывязаны да каталіцкай альбо пратэстанцкай традыцыі. Сёння прыблізна 68 % галандцаў не мае сувязі з аніводнаю рэлігіяю [28, s. 85].

У 2011 г. Кангрэгацыя Веравучэння выдала спецыяльнае распараджэнне, якое датычыла ўсіх мясцовых епіскапатаў, паводле якога лакальныя біскупы маюць весці расследаванне сексуальных злоўжыванняў з боку святароў адносна дзяцей. 6–9 лютага 2012 г. на папскім універсітэце Gregoriana ў Рыме адбыўся сімпозіўм “Verso la Guarigione ed il Rinnovamento” (“Да ацалення і абнаўлення”), у якім прынялі ўдзел 110 прадстаўнікоў лакальных епіскапатаў і 35 старшыняў манаскіх ордэнаў; усяго ў Рыме тады сабралося больш 200 асоб з усіх кантынентаў [29]. Канферэнцыя стала своеасаблівым адказам на заклік пантыфіка з 2010 г. шукаць адэкватных метадаў вырашэння праблемы педафіліі ў Касцёле.

Безумоўна, тэматыка педафіліі стала цяжарам пантыфікату Бэнэдыкта XVI [30]. Цалкам магчыма, што дадзенае пытанне не было апошнім й у прыняцці рашэння па адыходзе ў 2013 г.

3. Педафілія ў Касцёле за перыяд пантыфікату Францішка

У справе барацьбы з педафіліяй папа Францішак абвясціў на пачатку свайго пантыфікату (2013 г.), што будзе працягваць той кірунак, які быў вызначаны ягоным папярэднікам. За першы істотны крок новага біскупа Рыма можна лічыць усталяванне ватыканскай Камісіі па абароне непаўнагадовых. Дадзеная міжнародная Камісія была створана пасля кансультацый з членамі так званай Рады Кардыналаў C8, куды ўваходзяць восем найбольш блізкіх пантыфіку дарадцаў-пурпуратаў [31, p. 297–324]. Галоўнаю мэтаю Камісіі стала барацьба з педафіліяй і злоўжываннямі супраць дзяцей у Касцёле.

Тым не меней, Ватыкан не перастаў атрымліваць крытычныя ўвагі з нагоды шматгадовай таямніцы, якою пакрываў усе педафільскія скандалы ў сваіх шэрагах. Так, у лютым 2014 г. Камітэт Арганізацыі Аб’яднаных Нацый (ААН) па правах дзіцяці (UNCRC) апублікаваў свой рапарт з крытыкаю Апостальскага Пасаду за хаванне святароў-педафілаў. Крытыкуючы паставу маўклівай змовы, прадстаўнікі ААН канкрэтна ўказвалі на тыя моманты, які маюць быць зменены: перанос

святароў, якіх аскарджваюць у педафільскіх чынах, да іншай парафіі; адмовы прадастаўлення інфармацыі па справах; трактаванне педафільскіх злачынстваў у якасці амаральных чынаў, а не сур’ёзных злачынстваў; а таксама адмаўленне супрацоўніцтва з дзяржаўнымі органамі па дадзеных справах [32, p. 104–105]. ААНаўскія структуры яшчэ больш націскалі на Ватыкан, каб Каталіцкі касцёл выпрацаваў больш эфектыўныя сродкі і метады, што гарантавалі б ахвярам падтрымку і ахову.

У якасці адказу на крытыку ў 2014 г. амбасадар Апостальскага Пасаду пры ААН падаў афіцыйныя статыстыкі барацьбы з педафіліяй у Каталіцкім касцёле за апошнюю дэкаду: 842 святара былі выдаленыя з духоўнага стану за гвалты над дзецьмі, 2572 былі паддадзеныя іншым касцёльным карам [16, s. 312]. Акрамя таго, абп. Сільвана Тамазі, пастаянны назіральнік Апостальскай Сталіцы пры Арганізацыі Аб’яднаных Нацый у Жэневе (2003–2016), адказваючы на крытыку ААН[4], звярнуў увагу, што вучэнне Царквы не з’яўляецца толькі “пазіцыяй” ці “меркаваннем”, якія могуць быць змененыя ў адпаведнасці з палітычнай модай сучаснасці (ў сваім рапарце Камітэт ААН, між іншым, запатрабаваў ад Касцёла прызнаць аборты). Прэсавы сакратар Ватыкану, а. Федэрыка Ламбардзі звярнуў увагу на тое, што акрамя слушных увагаў, што ўтрымліваюцца ў рапарце, такія дакументы могуць мець на мэце атакаванне Касцёла.

Праз некалькі месяцаў Камітэт ААН супраць катаванняў прыхільна паставіўся да той дзейнасці, якую чыніць Ватыкан у барацьбе з педафіліяй і падтрымцы ахвяраў злачынстваў. 7 ліпеня 2014 г. па ініцыятыве Францішка адбылася ўрачыстая Святая імша з удзелам шасці ахвяраў касцёльнай педафіліі. Папа прасіў прабачэнне за злачынствы тых, хто “апаганіў Божае аблічча”, прызнаючы таксама, што адсутнасць рэакцыі з боку іерархіі Касцёла толькі ўзмацніла цярпенні ахвяр [16, s. 316]. У чэрвені 2015 г. Францішак зацвердзіў спецыяльны аддзел, які меў бы займацца даследваннем спраў хавання выпадкаў педафіліі мясцовымі біскупамі.

Сваю місію барацьбы з педафіліяй Францішак працягвае й у часе замежных візітаў: так, падчас апостальскага падарожжа да ЗША, на сустрэчу з пантыфікам у Філадэльфіі прыбылі пяць ахвяр. Чарговы раз Францішак выказаў свой смутак з нагоды маштабу граху, які апанаваў Каталіцкую царкву. Сваім апостальскім лістом 2016 г. пантыфік зрабіў больш сур’ёзныя абвастрэнні у кананічным праве, паводле якога біскупа можна будзе адклікаць не толькі за дачыненне да злачынства наўпрост, але таксама й за ўтойванне адмысловае справы. У выпадку, калі абвінавачванні пацвердзяцца, біскуп будзе мець 15 дзён на дабравольны адыход, і, калі таго не ўчыніць, будзе змушаны прымусова пакінуць сваю пасаду.

4. Педафілія і гомасексуалізм: невыгодныя паралелі

Сёння педафілія стала нечым значна большым, чым тыповым захаваннем некаторых злачынцаў. Сёння, па сутнасці, можна казаць пра з’яўленне цэлага

[4] Рапарт ААН таксама ўтрымліваў патрабаванні змяніць веравучэнне аб прыродзе чалавечай сексуальнасці, святасці жыцця і шлюбу [33, p. 13].

феномену прапагавання такой “культуры”, калі прыхільнікі такіх чынаў спрабуюць пераканаць грамадства ў сваім праве да адпаведнага выражэння сваіх эратычных пачуццяў. Часцяком мы таксама чуем пра тое, што ў свеце палітыкі, бізнесу і культуры існуе цэлае лобі тых, што не толькі прапагуюць такі лад жыцця, але аказваюць ціск на грамадскую думку, каб педафілія стала адной з магчымых прызнаных сексуальных арыентацый[5].

Разнастайныя абаронцы правоў чалавека ў некаторых краінах імкнуцца на заканадаўчым узроўні прасоўваць праекты змены мінімальнага ўзросту, неабходнага для легальнасці сексуальных кантактаў. Так, напрыклад, у Вялікай Брытаніі адвакат Барбара Г’юсан прапанавала зменшыць тую ўзроставую планку да 13 гадоў, і ўвесці больш пазітыўнае слоўнае апісанне сексульных рэляцый паміж дарослымі і дзецьмі [34, p. 11].

Не павінна здзіўляць і той факт, што на свеце існуюць дзясяткі (калі не сотні) розных арганізацый, што прапагуюць педафілію, выступаючы за яе легалізацыю: International Pedophile and Child Emancipation ды палітычная партыя Partij voor Naastenliefde, Vrijheid & Diversiteit (Нідэрланды), Boy Lovers and Zucchini Eaters (раней: Australian Paedophile Support Group, Аўстралія), Danish Pedophilie Association (Данія), Coalition Pédophilie Qubecois (Канада) [35, p. 13–15; 36, p. 88].

Звычаёвая рэвалюцыя 1968 г. моцна паўплывала на кшталт Касцёла: у 70–80 ыя  г., нягледзячы на забарону з 1965 г. прымаць у духоўныя семінарыі хлопцаў гомасексуальнае арыентацыі, да семінарый на Захадзе ўвайшлі тысячы геяў[6]. Таму сёння нікога не здзіўляе той факт, што багата духоўных Каталіцкай царквы кажа пра непасрэдную сувязь паміж гомасексуалізмам а бічом педафіліі, які ўдарыў па рэпутацыі Касцёла. Сувязь паміж гэтымі дзвюма з’явамі відавочная й у так званай літаратуры LGBTQ [37, p. 392].

Пра непасрэдную сувязь гомасексуалізму некаторых святароў са злачынствамі педафіліі кажуць біскупы Касцёла: Марыян Элеганці са Швейцарыі, Робэрт Бэйкер з Бірмінгем, Роберт Марліна з Мэдзісан. Але больш глыбокая прычына праблемы хаваецца ў тым, што Каталіцкі касцёл у імя талерантнасці і фальшывай міласэрнасці сёння амаль што пагадзіўся з тым, што яшчэ некалькі дэкадаў таму было абсалютна не да прыняцця ў святле традыцыйнае хрысціянскае маральнасці. Праўда, не забракла галасоў супраціву, у тым ліку ў каталіцкім асяроддзі, якія абсалютна не прымаюць тых абвінавачванняў, а нават больш – кажуць пра

[5] У 2013 г. Амерыканскае псіхіятрычнае таварыства апублікавала пятую рэдакцыю класіфікацыі псіхічных захворванняў “Diagnostic and Statistical Manual of Mental Disorders” (DSM-5), дзе педафілія была пададзеная як адна з магчымых сексуальных арыентацый. І толькі ў выніку пратэсту шэрагу інстытуцый такая ацэнка была прызнаная памылковаю і зміненая, а педафілію выкрэслілі з шэрагу магчымых арыентацый.

[6] Хаця гомасексуалісты і раней спрабавалі паступаць у духоўныя семінарыі, аднак даволі рыгарыстычныя абмежаванні былі больш трывалаю перашкодаю на іх шляху. Пасля апошняга сабору сітуацыя ўсё-такі змянілася.

хвалю гомафобіі ва ўлонні каталіцызму. Часам нават з’яўляюцца тэорыі, што ў Ватыкане дзейнічае моцнае лобі – так званая лавандавая мафія, якая не толькі імкнецца да “нармалізацыі” гомасексуальнае арыентацыі, але за ўсялякім коштам імкнецца да лібералізацыі нормаў і прынцыпаў маральнасці і этыкі Касцёла [38, p. 379–380].

У кастрычніку 2015 г. папулярны coming-out здзейсніў ксёндз Кшыштаф Харамса, другі сакратар Міжнароднай Тэалагічнай Камісіі пры Кангрэгацыі Веравучэння, выкладчык тэалогіі на ватыканскіх вучэльнях (пасля налажэння на яго кары і выдалення са стану духоўных Харамса пакінуў Рым і разам са сваім партнёрам выехаў да Барселоны). Пра маштаб трагедыі сведчыць таксама гісторыя затрымання кс. Луіджы Капоцы, сакратара блізкага да папы Францішка кард. Ф. Коккапальмерыя, за наяўнасць наркотыкаў і арганізацыю ў ватыканскіх палацах гомасексуальных оргій [39, p. 70–71]. Клопат Каталіцкі касцёл мае таксама з гандураскім кард. Оскарам Радрыгезам Марадзьяга, каардынатарам групы кардыналаў C8: 50 клерыкаў з ягонай семінарыі пачало пратэст супраць дамінацыі гомасексуальнай культуры. Крыху раней перад гэтым супрацоўнік кард. Марадзьягі біскуп Хуан Хасэ Пінэда быў адсунуты з пасады за фінансавыя махінацыі і … гомасексуалізм. Кардынал, безумоўна, усе аскарджванні адсоўвае, кажучы, што нічога пра тое не ведаў.

Не падлягае сумневу пасля аналізавання дадзеных рапартаў з Ірландыі, Аўстраліі, Нямеччыны ды іншых краін, што абсалютная большасць выпадкаў педафіліі духоўных датычыць ахвяр менавіта мужчынскага полу. Таму, безумоўна, сёння варта шчыра пра тое казаць, што сапраўднаю істотаю сексуальных скандалаў у Касцёле не з’яўляюцца педафілія сама ў сабе, але толькі, як правіла, гомасексуальная эфебафілія.

Такую тэзу пацверджвае не толькі сітуацыя з гвалтам супраць непаўнагадовых, але таксама і сексуальныя дамаганні адносна юнакоў і дарослых мужчын, пра што апошнім часам сведчыла сітуацыя з кардыналам Тэадорам Маккарыкам [40, p. 197] (на дадзены момант ужо былым: у 2018 г. іерарх Ватыкана падаў у адстаўку і адмовіўся ад кардынальскага капялюша, які атрымаў ад Яна Паўла ІІ). Цікавым фактам будзе для нас тое, што Маккарык быў нефармальна (у сэнсе кананічным) пакараны Бэнэдыктам XVI (амерыканскаму духоўнаму папа забараніў публічна цэлебраваць Эўхарыстыю), аднак Францішак тую кару пазней адмяніў і нават выслаў яго з дыпмісіяй у Кітай. Пра злоўжыванні былога кардынала стала вядома за прычынаю адкрытага лісту арцыбіскупа Карла Марыі Вігано, былога нунцыя Апостальскага Пасаду ў ЗША. У сваім лісце абп. Вігано абвінавачваў не толькі высокіх іерархаў Касцёла ў Штатах, але нават і самога Францішка ў спробе прыхавання сексуальных скандалаў у амерыканскім Касцёле [41, s. 57].

Ад 2005 г. абавязвае паноўленая праз Бэнэдыкта XVI забарона высвячаць на каталіцкіх духоўных мужчын гомасексуальнай арыентацыі, гомасексуальных схільнасцяў, а нават тых, хто прамуе такую культуру, аднак у шэрагу дыяцэзій

той наказ былога пантыфіка не выконваўся і надаль ігнараваны [42, p. 133–134]. Такая сітуацыя выклікае эфект лавіны: ужо сёння ў некаторых дыяцэзіях гомасексуальныя біскупы прамуюць “сваіх” святароў на высокія пасады, а гетэрасексуальныя клерыкі адсоўваюцца яшчэ на этапе побыту ў семінарыях.

Безумоўна, трэба трымацца здалёк ад нейкіх абагульненняў, якія б былі крыўдаю: вядома, што не кожны гомасексуаліст з’яўляецца педафілам, таксама як й не кожны педафіл, нават які гвалціць хлопцаў, будзе гомасексуалістам, як пра тое казаў былы прэфект Кангрэгацыі Веравучэння кард. Герхард Мюллер. Памылкаю тут будзе менавіта пэўнае размыванне маральнае дактрыны, калі, ідучы на саступкі чарговым меншасцям, Касцёл усё больш тым паказвае, што ў сферы маралі ды этыкі можна болей. Да гэтага прывёў, канечне, брак веры ў Святое Пісанне з боку некаторых каталіцкіх святароў, а таксама падмена тэалогіі псіхалогіяй. Пасля II Ватыканскага сабору замест таго, каб сувора караць святароў, якія здзейснілі злачынствы, некаторыя біскупы пачалі псіхалагізаваць: ці святары здзейснілі тое па прычыне нейкае траўмы, праблемы, ці можа патрабуюць дапамогі спецыяліста ці адпаведнай тэрапіі? З сумнымі наступствамі такога наіўнага і адначасова заганнага падыходу мы сёння й сутыкаемся.

*Падсумаванне*

Сексуальная рэвалюцыя 1968 г., працэсы глыбокай секулярызацыі і значнай лаіцызацыі заходніх грамадстваў, нараджэнне новай маральнасці і сексуальнай этыкі спрычыніліся да таго, што педафілія цягам доўгіх гадоў знаходзілася за своеасабліваю смугою культуры маўчання. Крызіс паглыбляўся таксама па прычыне змены падставовых парадыгматаў, што датычаць сямейнага і шлюбнага жыцця. Відочнаю праблемаю і памылкаю застаецца аднак спроба некаторых уплывовых дзеячаў а нават цэлых ліберальных асяроддзяў разглядаць сексуальныя злачынствы супраць непаўнагадовых у адарванні ад прапагаваных – вельмі часта тымі ж асобамі – пастулатаў сексуальнага вызвалення і новай этыкі кахання.

Узнімаючы пытанне педафіліі, варта памятаць, што сёння існуюць розныя метады барацьбы з тым злачынствам: медыкаментозныя і псіхалагічныя, ці нават псіхіятрычныя. Ад педафіліі неабходна адрозніваць эфебафілію, хаця ў абодвух выпадках злачынца мае мець свядомасць адказнасці і кары, якую панясе за здзейсненыя ўчынкі. Такі падзел не столькі мае быць нейкаю маральнаю ільготаю, але больш дакладна паказаць прычыны гэтай ганебнай з’явы, дзеля таго, каб можна было знайсці найбольш адпаведныя зарадчыя сродкі.

Нельга адмаўляць таксама й таго, што, звязаны з сексуальнымі скандаламі маральны крызіс у Касцёле, з’яўляецца вынікам нядбайнасці і часта ігнаравання так сур’ёзных злачынстваў за перыяд папярэднікаў Бэнэдыкта XVI і Францішка. Крызіс быў на столькі глыбокі, асабліва ў некаторых краінах, што гэта пацягнула за сабою крызіс веры (толькі ў Нідэрландах штогод Касцёл пакідаюць каля 18 тыс. вернікаў, а да 2020 г. у краіне цюльпанаў плануецца закрыццё траціны ўсіх тамтэйшых каталіцкіх касцёлаў, якія пазней часцяком становяцца склада-

мі, рэстарацыямі альбо нават скейт-паркамі), спрычынілася да рознагалосся і ўнутраных падзелаў ва ўлонні лакальных Касцёлаў.

Падставаю гэтаму сталі ў тым ліку альтэрнатыўныя катэхізісы каталіцкага навучання, як тое адбылося ўва ўзгаданых Нідэрландах, дзе даволі папулярным стаў выдадзены ў 1966 г. ва Утрэхце “Галандскі катэхізіс” аўтарства фламандскага манаха-дамініканіна, аднаго з айцоў ІІ Ватыканскага сабору (sic!) Эдварда Шыллебеекса (1914–2009). Прасякнуты ідэямі мадэрнізма каталіцкі тэолаг прапаноўваў змяніць шэраг маральна-этычных праўд каталіцызму, з асаблівым націскам на новае разуменне істоты сям’і ды чалавечае сексуальнасці [28, s. 89].

Са смуткам трэба адзначыць, што цягам апошніх дзвюх дэкадаў грамадская думка больш засяродзілася менавіта на злачынствах, здзейсненых каталіцкімі святарамі, у дыскусіі ў СМІ амаль цалкам адсутнічае праблема педафіліі ў сем’ях (а менавіта там назіраецца самая вялікая колькасць ахвяр, калі даходзіць да выпадкаў інцэсту), у асяроддзі палітыкаў, у грамадскіх ці спартовых арганізацыях, ці нават у іншых рэлігійных дэнамінацыях [43, s. 247–248]. Неабходна памятаць, што адзінкавыя злачынствы не могуць і не павінны быць генералізаваныя, нельга аскарджваць увесь Касцёл. Крытыкі, правільней было б назваць іх крытыканамі, чамусьці (цікава, чаму?) не жадаюць гэтага разумець і актыўна пратэстуюць пасля, напрыклад, чарговага акту тэрору, калі ў СМІ спрабуюць абвінаваціць усіх мусульманаў, а не канкрэтнага чалавека ці групу людзей у здзейсненым злачынстве. А вось, калі справа даходзіць да каталіцызму ці нават шырэй, да хрысціянства ўвогуле, раптоўна “забываюцца” пра талерантнасць ды аб’ектывізм, усіх саджаючы на лаўку вінаватых. Такі падыход таксама шмат аб чым сведчыць пра свет і грамадства, у якім мы сёння жывем.

Апошнім часам абуджаецца маральная свядомасць, калі ідзе гутарка пра абарону непаўнагадовых у кантэксце сексуальнага выкарыстання дзяцей. Як слушна заўважае італьянскі ксёндз Ф. Дзі Нато, той, хто замоўчвае такія чыны, сам спрычыньваецца да вялікай драмы, якую сёння называюць халакостам бягучага стагоддзя.

1. Woźnicki Ł. Największe problemy Kościoła? Pedofilia, homoseksualizm, polityka [SONDAŻ]. URL: http://wyborcza.pl/1,75398,14822409,Najwieksze_problemy_Kosciola__Pedofilia__homoseksualizm_.html?disableRedirects=true (дата звароту – 01.02.2019).

2. Kobyliński A. Problem molestowania seksualnego dzieci w Australii // Studia Ecologiae et Bioethicae. 2016. R. 14. № 2. S. 57–75.

3. Callaghan A. Realism and the ‘Inaudible’ Score for *Spotlight* // Context. 2017. № 42. P. 53–66.

4. Di Noto F. La pedoflia. I mille volti di un olocausto silenzioso. Milano: Paoline Editoriale Libri, 2002. 160 p.

5. Lalieux K. Abus sexuels dans l’Église: paroles libérées. Bruxelles: Luc Pire éditions, 2012. 126 p.

6. Moretti A. Voglia di caramelle. Storie vere dalle nebbie della pedoflia sociale e religiosa. Napoli: Iemme Edizioni, 2016. 101 p.

7. Kowalski J. Moralność w postmodernizmie i wyzwania kierowane pod adresem Kościoła i moralnej chrześcijańskiej // Sympozjum. 1998. № 2 (3). S. 23–35.

8. Blaine B. The Policy Seeks Silence but the Church Needs Prevention // Sexual Abuse in the Catholic Church: A Decade of Crisis, 2002–2012 / eds. Th. G. Plante, K. L. McChesney. Santa Barbara-Denver-Oxford: ABC-CLIO, 2011. P. 155–170.

9. Дерягин Г. Б. Криминальная сексология: курс лекций для юридических факультетов. Москва: Московский университет МВД РФ, Изд-во "Щит-М", 2008. 552 с.

10. Vitale M. Minorenni mercenarie di sesso. Figlie squillo. Roma: Sovera Edizioni, 2014. 96 p.

11. Prada J. R. Abuso sexual infantil por parte de clérigos y religiosos católicos. Bogotá: San Pablo, 2010. 49 p.

12. Giron G. L. Underexposed Child Sex Tourism Industry in Guatemala // International Sex Trafficking of Women & Children: Understanding the Global Epidemic / eds. L. Territo, G. Kirkham. New York: Looseleaf Law Publications, 2010. P. 445–456.

13. Allyn D. Make Love, Not War: The Sexual Revolution: An Unfettered History. London – New York: Routledge, 2016. 404 p.

14. Marlin G. J., Miner B. Sons of Saint Patrick: A History of the Archbishops of New York, from Dagger John to Timmytown. San Francisco: Ignatius Press, 2017. 506 p.

15. Kobyliński A. Skandal i zło pedofilii // wSieci. 2017. № 11. S. 44–46.

16. Płachecka A. Pedofilia w Kościele katolickim za pontyfikatów Benedykta XVI i papieża Franciszka // Świat Idei i Polityki. 2017. T. 16. S. 301–323.

17. Parkinson P., Cashmore J. Assessing the different dimensions and degrees of risk of child sexual abuse in institutions. Sydney: Royal Commission into Institutional Responses to Child Sexual Abuse, 2017. 110 p.

18. Cafardi N. P. Before Dallas: The U.S. Bishops' Response to Clergy Sexual Abuse of Children. New York – Mahwah: Paulist Press, 2008. 255 p.

19. Küng H. Ist die Kirche noch zu retten? München: Piper, 2011. 261 s.

20. Judson P. Scandal in Seminary // Contemporary Austrian Studies: Sexuality in Austria, vol. 15 / eds. G. Bischof, A. Pelinka, D. Herzog. London –New York: Routledge, 2017. P. 145–157.

21. Zakrzewicz A. Głosy spoza chóru: rozmowy o Kościele, papieżach, homoseksualizmie, pedofilii i skandalach. Warszawa: Czarna Owca, 2013. 366 s.

22. Oldmixon E. A., Calfano B. R. Clerical Burnout and Political Engagement: A Study of Catholic Priests in Ireland // The Catholic Church in Ireland Today / eds. D. Carroll Cochran, J. C. Waldmeir. Lanham – Boilder – New York – London: Lexington Books, 2015. P. 65–80.

23. Kobyliński A. Pedofilia w Irlandii // Do Rzezcy. 2018. № 35. S. 78–79.

24. D'Antonio M. Mortal Sins: Sex, Crime, and the Era of Catholic Scandal. New York: Macmillan, 2013. 416 p.

25. Kobyliński A. Pedofilia – tragedia ofiar, Kościoła i społeczeństwa // Polonia Christiana. 2017. № 59. S. 62–64.

26. Kobyliński A. Pedofilia w Belgii: rewolucja seksualna, sekularyzacja i nowa moralność // Studia Bobolanum. 2017. № 1. S. 219–236.

27. Corr F. M. Broken Promises: Whatever Happened to Vatican Council II? Bloomington: Trafford Publishing, 2012. 204 p.

28. Kobyliński A. Pedofilia w Holandii: przyczyny, konsekwencje, ocena moralna // Studia Ecologiae et Bioethicae. 2017. R. 15. № 5. S. 83–95.

29. Scicluna Ch. J., Zollner H., Ayotte D. J. Verso la guarigione e il rinnovamento: Simposio 2012 della Pontificia università gregoriana sugli abusi sessuali su minori. Roma: Pontificia università gregoriana, 2012. 305 p.

30. Erlandson G., Bunson M. Pope Benedict XVI and the Sexual Abuse Crisis: Working for Redemption and Renewal. Huntington: Our Sunday Visitor Pub. Division, 2010. 207 p.

31. Vallely P. Pope Francis: Untying the Knots. The Struggle for the Soul of Catholicism. London – Oxford – New York – New Delhi – Sydney: Bloomsbury, 2015. 240 p.

32. Govier T. Victims and Victimhood. Peterborough: Broadview Press, 2015. 248 p.

33. Committee on the Rights of the Child, Concluding observations on the second periodic report of the Holy See (Adopted by the Committee at its sixty-fifth session (13–31 January 2014). CRC/C/VAT/CO/2, 25 February 2014.

34. Thomas T. Sex Crime: Sex offending and society. Oxon – New York: Routledge, 2015. 260 p.

35. O’Donnell I., Milner C. Child Pornography: Crime, Computers and Society. Devon – Portland: Willan Publishing, 2007. 240 p.

36. Hendershott A. B. The Politics of Deviance. New York: Encounter Books, 2002. 194 p.

37. Hudale M. The Matrix of Mysticism: A Call for a New Reformation. Maitland: Xulon Press, 2010. 476 p.

38. Soral W., Cichocka A., Bilewicz M., Marchlewska M. The Collective Conspiracy Mentality in Poland // Conspiracy Theories and the People Who Believe Them / ed. Uscinski J. E. New York: Oxford University Press, 2019. P. 372–384.

39. Lawler Ph. F. Lost Shepherd: How Pope Francis is Misleading His Flock. Washington: Regnery Gateway, 2018. 256 p.

40. Horowitz J. Pope Francis Long Knew of Cardinal’s Abuse and Must Resign, Archbishop Says // Pope Francis / The New York Times Editorial Staff. New York: New York Times Educational Publishing, the Rosen Publishing Group, 2019. P. 195–201.

41. Ziomber M. Relatywiści w Mieście Boga // Polonia Christiana. 2018. № 65. S. 57–58.

42. Swenson D. S. Society, Spirituality, and the Sacred: A Social Scientific Introduction. Toronto: University of Toronto Press, 2009. 464 p.

43. Kukła A. Przemoc seksualna wobec dzieci // Studia Redemptorystowskie. 2010. № 8. S. 244–254.

## SUMMARY

**Siarhei Anoshka**

**Catholic Church in the face of modern moral challenges**

One of the most pressing and key problems faced by the Catholic Church today – pedophilia (sometimes “paedophilia”) among priests is researched. Starting from a brief analysis of the phenomenon of pedophilia along with the necessary need to distinguish the same from ephebophilia, in investigation specific examples of revealed, examined and confirmed cases of sexual abuse against minors, as well as consequent moral and ethical issues are described.

Particular parts of the article are devoted to the years of the pontificate of Pope Benedict XVI and Pope Francis. Special attention is paid to preventive measures and methods of combating pedophilia in the Catholic Church. Each pope looked at this problem differently, but the basic conclusion is that the issue of sexual assault in Catholicism cannot be honestly considered if there is no proper reflection on the potential sources of ideological threats. The changes in the field of ethics and sexuality caused by the dissemination and propaganda of the so-called sexual revolution ideology of 1968 are explored.

Without ignoring significant and important issues, the author also tried to answer the question of where the current roots of moral abuse and crime are stuck and hidden. A reflection on the possible connections between homosexuality and pedophilia in the Catholic Church is done. In the distant

past, one can see the scale of neglect that occurred as a result of either a change in doctrinal teaching or an explicit denunciation of obedience to the hierarchical authorities in the Church.

In summary, an attempt to answer questions about the depth of the modern moral crisis is made. Conclusions are made that there is a lack of good will in some environments, including the Church, to deal seriously with the problem of pedophilia, because it would necessitate criticizing the ideology of tolerance popular in Western countries and acceptance of the non-heterosexual orientation, and this would already result in a real ideological crisis. It may be for this reason that so many critics remain on the plane of attacking the Catholic Church without any deeper consideration.

*Keywords:* homosexuality, canon law, Catholic Church, the papacy, pedophilia, sexual offenses, ephebophilia

DOI 10.33294/2523-4234-2019-29-1-201-210

**Алла Арістова**

# Релігійний і релігієзнавчий туризм в Україні: проблеми розвитку

Здійснена релігієзнавча оцінка низки понять туризмознавства; обґрунтовано доцільність введення поняття "релігієзнавчий туризм". Узагальнені й проаналізовані розбіжності релігійного і релігієзнавчого туризму як різних за багатьма параметрами видів туристичної діяльності. Окреслені проблеми розвитку релігійного і релігієзнавчого туризму в Україні та їхнє значення для розвитку міжконфесійного комунікування й толерантизації суспільного середовища.

*Ключові слова:* паломництво, релігійний туризм, релігієзнавчий туризм, туризмознавство, туристична діяльність, міжрелігійна толерантність

Повноцінне та гідне входження України до європейського культурного простору забезпечується, серед іншого, і засобами туризму. Через туристичні шляхи і маршрути, обмін туристами й технологіями туристичної індустрії країна відкриває себе світові та вбирає полікультурний і поліетнічний світ у себе. Серед складного й розгалуженого комплексу, що ним став сучасний туризм, окремішнє місце займає туризм релігійний. І річ не тільки в тім, що у давніх релігійних мандрівках прочан і пілігримів історично закорінений феномен туризму, але в тому, що за силою своєї мотивації, особистісними спонуками до туристичної активності, глибоким історико-культурним та духовним змістом, впливом на ціннісні горизонти людини – релігійний туризм якісно вирізняється серед інших видів туризму.

Між тим, теоретико-аналітичне опрацювання проблем релігійного туризму лишається, скоріше, завданням, аніж здобутком. Навіть саме поняття "релігійний туризм" сповнене суперечливих конотацій і підходів, які рідко відчитуються науковцями. Так, у зарубіжних джерелах релігійний туризм визначено як тип туризму, коли люди подорожують індивідуально або в групах заради паломництва, місіонерства або з метою проведення дозвілля у товаристві одновірців [1, с. 448]. Тим самим наголошується на наявності певного способу релігійної діяльності